Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 24 февраля 2010 года**

## ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже единым лотом принадлежащего ЗАО «Минский инструментальный завод» (продавец) имущества оздоровительного лагеря «Восток», расположенного по адресу: Минская область, Минский район, Острошицко-Городокский с/с, западнее д. Острошицкий Городок. В состав лота входит следующее имущество:**

| № п/п | Наименование и характеристики продаваемого имущества |
|---|---|
| 1. | Корпус № 1-клуб (здание специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения) площадью 389,4 кв. м, инв. номер 600/С-120065 |
| 2. | Корпус № 2 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 152,0 кв. м, инв. номер 600/С-120064 |
| 3. | Корпус № 3 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 144,8 кв. м, инв. номер 600/С-120063 |
| 4. | Корпус № 4 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 148,5 кв. м, инв. номер 600/С-120062 |
| 5. | Корпус № 5 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 199,2 кв. м, инв. номер 600/С-120061 |
| 6. | Корпус (8 комнат) № 6 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 229,2 кв. м, инв. номер 600/С-120060 |
| 7. | Корпус (8 комнат) № 7 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 211,6 кв. м, инв. номер 600/С-120059 |
| 8. | Корпус хозяйственный (здание нежилое) площадью 90,3 кв. м, инв. номер 600/С-120056 |
| 9. | Кухня-склад (здание специализированное для общественного питания) площадью 31,1 кв. м, инв. номер 600/С-120057 |
| 10. | Столовая (здание специализированное для общественного питания) площадью 388,3 кв. м, инв. номер 600/С-120052 |
| 11. | Цех предварительной очистки картофеля (здание нежилое) площадью 22,3 кв. м, инв. номер 600/С-120055 |
| 12. | Овощехранилище с подвалом (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 91,7 кв. м, инв. номер 600/С-120058 |
| 13. | Медпункт (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) площадью 127,7 кв. м, инв. номер 600/С-120054 |
| 14. | Спальный корпус на 72 места (незавершенное законсервированное капитальное строение) площадью 1584,4 кв. м. |

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке площадью 5,1124 га, кадастровый номер 623685206101000889.

Начальная цена – 1 325 848 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 130 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в срок, указанный в договоре купли-продажи, по согласованию с продавцом.

Аукцион состоится **24 февраля 2010 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 18.01.2010 по 22.02.2010 в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(029)110 90 02 – ЗАО «Минский инструментальный завод».**

**Сайт в интернете: www.mgcn.by.**

**МГКУ ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ**

## ПРОВОДИТ ПРОЦЕДУРУ ЗАПРОСА ЦЕНОВЫХ ПРЕДЛОЖЕНИЙ НА ЗАКУПКУ В 2010 ГОДУ:

■ резцов W-6H с ограничительной шайбой или аналога для фрез WIRGEN DC 2000 и W-500 в количестве 4800 шт.;

■ резцов ДЗ-7 или аналога для фрезы АМКОДОР 8047А в количестве 1200 шт. за счет собственных средств предприятия.

Ориентировочная стоимость закупки составляет 78 400 000 руб. РБ.

Конечный срок подачи конкурсных предложений до 11.00 27.01.2010 г. По условиям процедуры закупки и с предложениями обращаться по адресу: 213000, г. Могилев, Чаусское шоссе, 4-й км; т./ф.: **8 0222 46 16 09,** адрес электронной почты **dsp-mog@tut.by.** УНН 700444528.

# ТВОРЧЫ РУБЕЛЬ

### Сельскія таленты

Уся гэта мастацкая «каша» заварылася напярэдадні Новага 2010 года. У гаспадарцы штогод праводзіцца конкурс на лепшае навагодняе афармленне працоўнага месца. У вёсках мала адчуваецца перадсвяточная мітусня, не хапае ілюмінацыі і ўпрыгажэнняў. За працай на ферме можна і не заўважыць свята, а таму калгаснікі самі ствараюць сабе настрой.

Сёлета традыцыйны конкурс дапоўнілі канцэртам «Алё, мы шукаем таленты!». У ім бралі ўдзел прадстаўнікі ўсіх падраздзяленняў гаспадаркі. Кіраўніцтва вылучыла сур'ёзны аргумент: у каго не хопіць творчых сілаў — давядзецца выбыць са спаборніцтва за навагоднія прэміі.

— Вынік мяне ўразіў! — прызнаўся старшыня калгаса Аляксандр Лапацентаў. — Нашы вяскоўцы маюць мора творчых рэзерваў. Трэба толькі займацца з імі!

У канцэрце атрымалася тры дзясяткі нумароў. Многія выйшлі на сцэну першым разам і мелі поспех. Дырэктара цэнтра культуры Аляксея Чудакова найбольш уразілі беларускамоўныя тэатральныя нумары ў выкананні жанчын, якія працуюць на фермах. Такой ігры і такога поспеху ў публікі не чакалі! Цяпер, падаецца, можна было б «замахнуцца і на Вільяма нашага Шэкспіра». Аднак жанчыны больш схіляюцца да нацыянальнай драматургіі, бо і самі выглядаюць як шчырыя каларытныя беларускі.

— Ініцыятыва кіраўніка «Радзімы» дасць штуршок культурнаму жыццю, — пагадзіўся Аляксей Чудакоў. — Дарэчы, і я за савецкім часам атрымліваў 3 рублі за кожны прыход на рэпетыцыю. Безумоўна, мастацкая самадзейнасць — гэта вялікая праца, але ж і задавальненне не меншае.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### З канапы на сцэну

— Паверце, людзям ужо даўно надакучыла піць гарэлку! — так распавядае пра ідэю з падтрымкай артыстаў-аматараў Лапацентаў.

За апошнія тры дзясяткі гадоў, тлумачыць кіраўнік, у «Радзіме» літаральна ўсе новыя дамы ці кватэры будаваліся з выгодамі. Калгаснікі забяспечаны гарадскім камфортам. Не трэба, напрыклад, насіць і грэць ваду. Мара пра цёплыя прыбіральні даўно спраўдзілася.

Не вельмі шануецца ў тутэйшых утрыманне жывёлы і вялікая падсобная гаспадарка. На тэрыторыі гаспадаркі хапае крамаў, якія прапануюць штодня свежыя харчы, а заробак людзей дазваляе іх набываць.

— Наша праца з людзьмі скіраваная на тое, каб яны прыносілі максімальную карысць на працоўным месцы, таму і бытавыя праблемы зведзеныя да мінімуму, — прызнае старшыня. — Але чым займацца чалавеку, калі ён прыходзіць дадому? Ногі закруціць і легчы на канапу перад тэлевізарам!

Вось каб адарваць працаўніка ад гультайства і заняць вольны час цікавай справай, заахвочваюцца ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

— І, вядома ж, усё робіцца для павелічэння заробку людзей, — дадае Аляксандр Лапацентаў. — Каб нашым людзям не трэба было з усіх жылаў цягнуцца, а добрасумленна працаваць і атрымліваць за гэта нармальную капейку. У нашай сістэме аплаты працы атрымліваецца, што на 1 рубель асноўнага заробку прыпадае 1 рубель даплаты. Але дадатковыя грошы не проста так, а за добрую справу, каб людзі імкнуліся да лепшага.

### Ні чаркі, ні цыгарэты

На мехдвары «Радзімы» няма нават празрыстага намёку на пах тытуню. Каляндар на 2010 год з тыграм упрыгожаны келіхам віскі з лёдам, але алкаголь дачынення да тутэйшых працаўнікоў не мае. Не, тут не пануе сухі закон, але людзі ведаюць межы разумнага і прыстойнага. Тут даўно забыліся на п'янства на працы — кіраўнікі не ходзяць з пугамі за алкаголікамі.

З даўніх часоў у «Радзіме» даплачваюць 15 % да заробку за тэхналагічную працу і добрыя паводзіны ў побыце. Гэта значыць — ніякіх п'янак, прагулаў працы і скандалаў у сям'і. Калісьці гэта мера сталася першым крокам да дысцыпліны пасля перабудовачных хістанняў. Гаспадарку вырашылі захаваць на падмурку матэрыяльнага заахвочвання і, з іншага боку, спагнання ў выпадку парушэння агульнапрынятых нормаў працы і жыцця.

— У чым каштоўнасць нашай сістэмы? — пытаецца Аляксандр Лапацентаў і тут жа адказвае. — Калі чалавек спатыкнуўся, то назаўтра раніцай ён можа лёгка падлічыць, у якую канкрэтную суму грошай абышоўся яго сям'і непрыгожы ўчынак. А нашы людзі пісьменныя, лічаць добра! Ды і як можна з пахмелля кіраваць новай сучаснай тэхнікай, дзе ўсталявана па некалькі камп'ютараў?!

У гаспадарцы амаль што выкаранена небяспечнае для здароўя курэнне: тут жартуюць, што хутка адзінкавыя аматары тытуню будуць бегаць на перакур у поле. Таму што вось ужо некалькі гадоў тым, хто не курыць, даплачваюць 10 % да заробку.

Каб яшчэ болей заахвоціць людзей здаровым ладам жыцця, старшыня прыняў хітрае рашэнне: калі ў падраздзяленні не курыць 85 % работнікаў, то даплаты ў гэтым калектыве некурцам складаюць ужо 15 %. Цяпер Аляксандр Лапацентаў можа сказаць дакладную лічбу: у калгасе з 360 чалавек не кураць роўна 86 %.

### Мастацкія рэзервы

Гэта яшчэ далёка не ўсё. У «Радзіме» даплаты робяцца настаўнікам, старанным вучням і бацькам, якія добра выхоўваюць сваіх дзяцей. З больш за 200 вучняў Вішоўскай сельскай школы — 76 стыпендыятаў. Гараджане ў «Радзіму» працаваць не прыязджаюць: тут выхоўваюць сваіх будучых працаўнікоў. І нездарма большасць калгаснікаў — гэта мясцовыя жыхары, якія нарадзіліся і выраслі на Бялыніччыне ды засталіся тут жыць і працаваць. Маладым сем'ям гаспадарка таксама дапамагае з аплатай камунальных паслугаў.

Праўда, нягледзячы на прызнанне каштоўным вопыту «Радзімы», яго шырокага ўкаранення ў сельскіх гаспадарках і арганізацыях рэгіёна не назіраецца. Аляксандр Лапацентаў кажа, што тут патрэбна добрая стартавая пляцоўка ў сэнсе сродкаў на рахунках, рашучасці кіраўніка і ўзаемаразумення ў калектыве.

— Ці збываюцца мае мары? — ён спрабуе адказаць на гэта пытанне пад рынгтон на яго тэлефоне вядомай песні Юрыя Антонава. — Я скажу, што ў любой сельскай гаспадарцы, нават самай беднай, ёсць мора рэзерваў. Тым болей яны ёсць у «Радзімы». Хутка споўніцца 30 гадоў, як я кірую гаспадаркай. І я бачу, куды ісці далей разам са сваімі людзьмі. Самае галоўнае, што мы верым і давяраем адно аднаму.

Ва ўсякім разе, вестку пра новыя даплаты ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці калгаснікі сустрэлі апладысментамі. Натуральна, што далёка не кожны можа атрымаць дадатковыя грошы: не кожнаму дадзена стаць артыстам, часу і высілкаў патрабуюць рэпетыцыі. Але кожнаму, хто рызыкне, давядзецца хоць раз на квартал выйсці на сцэну. Так што лютаўскі канцэрт у гонар справаздачна-выбарчага сходу ў «Радзіме» не проста чакаюць, а вучацца спяваць, танцаваць і дэкламаваць.

**Ілона ІВАНОВА.**
*Бялыніцкі раён.*

## МАРАЗЫ БУДУЦЬ ТОЛЬКІ МАЦНЕЦЬ

**Цяпер над тэрыторыяй Беларусі гаспадарыць магутны і халодны антыцыклон, які завітаў да нас з боку Скандынавіі, паведаміла рэдакцыі начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Людміла Парашчук.**

Сёння ўдзень захаваецца воблачнае надвор'е, пераважна без ападкаў, раніцай намаразь, месцамі слабы туман, на дарогах галалёдзіца, 6—13 градусаў, месцамі да 15—16 марозу. У суботу і нядзелю ўначы 11—18, пры праясненнях да 20—25. Удзень да мінус 6—13. На працягу наступнага тыдня ўначы ад 8—11 да 20—25 марозу, удзень да 18 марозу. Сіноптыкі запэўнілі, што для азімых такія маразы не страшныя, бо вышыня снежнага покрыва складае 18—25 сантыметраў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Абзац

◢ Споўнілася 125 гадоў з дня нараджэння Юрыя Тарыча, выдатнага беларускага і расійскага кінарэжысёра, сцэнарыста. Ён увайшоў у гісторыю беларускага мастацтва як заснавальнік і стваральнік нацыянальнага кіно. Здымаў мастацкія і дакументальныя фільмы. Памёр у 1967 годзе.

◢ **Даішнік пратараніў машыну пракуратуры. У Смаленскай вобласці (РФ) інспектар дарожна-патрульнай службы на асабістым аўтамабілі «Субару» ўрэзаўся лоб у лоб у машыну «Шэўрале», якой кіраваў в.а. пракурора Красненскага раёна вобласці. У выніку пасажырка «Шэўрале», вядучы спецыяліст міжраённага следчага аддзела, загінула. Вадзіцель і два памочнікі пракурора атрымалі траўмы. Сам вінота ДТЗ абышоўся драпінамі. Супраць інспектара ДПС заведзена крымінальная справа.**

◢ Фінскія навукоўцы па выніках маштабнага даследавання з удзелам 26 тыс. мужчын, якія кураць, прыйшлі да высновы, што ўжыванне прадуктаў, багатых на магній, перашкаджае развіццю ішэмічнага інсульту. Назіранне за ўдзельнікамі вялося на працягу 13,5 года. У тых, хто ўжываў больш прадуктаў з магніем, рызыка ішэмічнага інсульту была на 15 % ніжэйшай, чым у тых, хто спажываў яго менш. Багатай крыніцай магнію навукоўцы назвалі цэльназерневыя прадукты. Акрамя таго, гэты мікраэлемент утрымліваецца ў арэхах, семках, чарнасліве, марской капусце і зялёнай агародніне.

### Поўны абзац

◢ **Святар выйграў у карты для свайго прыходу 100 тыс. долараў. Малады святар з каталіцкага прыходу ў Паўднёвай Караліне (ЗША) Эндру Трап узяў удзел у турніры па покеры. Сеўшы за гульнявы стол у сутане, ён выйграў 100 тыс. долараў. Галоўны прыз айцец Эндру не выйграў, аднак дайшоў да паўфіналу. Выйгрыш святар унёс у фонд будаўніцтва новага храма. Каб узяць удзел у турніры, а. Эндру спытаў дазволу ў царкоўных іерархаў.**

◢ Псіхічна нездаровая жанчына ў Мінску адрэзала мужу, які спаў, нажом геніталіі. Жанчына 1956 года нараджэння знаходзіцца на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансеры. Выпадак адбыўся 13 студзеня каля 23 гадзін. Мужу было 56 гадоў, ён памёр на месцы. Пракуратура Першамайскага раёна распачала крымінальную справу, паведамляе БЕЛТА. Вядзецца следства.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**УПРАВЛЯЮЩИЙ В ПРОИЗВОДСТВЕ ПО ДЕЛУ О БАНКРОТСТВЕ**

**извещает о проведении 1 февраля 2010 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего республиканскому дочернему унитарному предприятию «Мозырский оптово-розничный Торговый комплекс» (РДУП «Мозырский ОРТК»), расположенного по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13**

| № п/п | Объект продажи | Характеристика объекта | Начальная цена продажи (в т. ч. НДС 20 %) руб. | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| | | **ЛОТ №1** | | |
| 2 | Здания двух складов, оборудование. | **Склад № 1** – одноэтажное здание, общая площадь 243,20 м², стены кирпичные, асбестоцементные листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение. **Склад № 2 (основное)** – одноэтажное здание, общая площадь 670,14 м², стены кирпичные, металлические листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение. **Пристройка (склад № 2)** – одноэтажное здание, общая площадь 316,60 м², стены кирпичные, асбестоцементные листы, перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы цементные, электроосвещение. **Уборная** – общая площадь 5,27 м². **Покрытие асфальтовое** 1844,63 м²; **ограждение кирпичное** протяженностью – 40,6 м.п; **ворота металлические.** | **142 305 420** | **14 230 000** |

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

**Аукцион состоится 1 февраля 2010 года по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13. Начало в 12.00.**

Объекты недвижимости находятся на земельном участке, имеющем ограничение в использовании согласно Положения о порядке установления размеров и границ водоохранных зон и прибрежных полос водных объектов и режиме ведения в них хозяйственной деятельности, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 21 марта 2006 г. № 377.

С перечнем и состоянием имущества можно ознакомиться по месту его нахождения.

Порядок подачи документов определен условиями проведения аукциона.

Для участия в аукционе участник перечисляет платежными поручениями задаток на **р/с 3012001320013, отделение ОАО «БПС-Банк» в г. Мозыре, МФО 151501354. Получатель платежа – РДУП «Мозырский оптово-розничный торговый комплекс». УНП 400083650.**

**Документы на участие в аукционе принимаются с даты опубликования информационного извещения по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Иваненко, 13 с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням до 29 января 2010 года включительно.**

При подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, нотариально заверенные в установленном порядке копии учредительных документов (устав, свидетельство о государственной регистрации), письменное решение соответствующего органа управления, разрешающее приобретение имущества (если это необходимо в соответствии с учредительными документами участника торгов); физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Шаг аукциона 5 %.

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 5 мая 2009 года «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)».

Победитель торгов обязан после подписания протокола о проведении аукциона: в течение 10 рабочих дней подписать договор купли-продажи, возместить расходы, связанные с проведением торгов, и расходы по изготовлению землеустроительных дел по выделению земельного участка.

**Контактные телефоны организатора аукциона: (029) 657 27 13, (029) 531 96 14.**

## ПА ЗДАРОЎЕ — У «ЯСЕЛЬДУ»

**«Ясельда» — гэта сучасны санаторый для людзей сталага ўзросту на Палессі. 15 гадоў таму яго ўтварылі на базе прафілакторыя меліяратараў, які ў сваю чаргу меў папулярнасць на тэрыторыі ўсяго былога Саюза. І вось у маляўнічыя мясціны каля вёскі Пачапава сталі прыязджаць ветэраны вайны і працы, інваліды, каб папраўляць здароўе, падыхаць паветрам запаведных мясцінаў непаўторнай палескай прыроды. Дарэчы, недалёка размешчана ўрочышча Дзікое з унікальным аднайменным возерам. Вадаём аказаўся славуты каштоўнымі сапрапелевымі гразямі, якія выкарыстоўваюцца ў лячэбнай практыцы санаторыя.**

Паводле інфармацыі прэс-службы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, сёння ў рэспубліцы для аздараўлення ветэранаў вайны і працы, а таксама інвалідаў працуюць чатыры санаторыі на 724 месцы. Два з іх знаходзяцца ў Брэсцкай вобласці — «Белая Вежа» ў Камянецкім раёне і «Ясельда» — у Пінскім. Ва ўсіх чатырох установах створана спецыяльная лячэбная база і распрацаваны адаптаваныя для людзей пажылога ўзросту метады лячэння. Так, за час свайго існавання санаторый «Ясельда» прыняў больш за 16 тысяч наведвальнікаў.

А ўчора ў «Ясельдзе» было свята — урачыстае адкрыццё чацвёртага пускавога комплексу санаторыя. У ліку гасцей адкрыцця былі віцэ-прэм'ер краіны Уладзімір Патупчык, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валяр'ян Кароль, кіраўнікі Брэсцкай вобласці і Пінскага раёна. Пасля перарэзання сімвалічнай стужкі ўдзельнікі цырымоніі наведалі абноўленае водалячэбнае аддзяленне, залу лячэбнай фізкультуры, пакой псіхалагічнай разгрузкі, актавую, танцавальную, гульнявую залы, прайшліся па новым пераходзе ў гразелячэбніцу. Усё ззяла навізной і прывабнасцю. Словы падзякі гучалі ў гэты дзень у адрас віцэ-прэм'ера, які курыраваў будаўніцтва, а таксама ў адрас будаўнікоў — ПМК-33 ААТ «Пінсксаўгасбуд», якія правялі будаўніцтва і рэканструкцыю ў даволі сціслыя тэрміны.

Як сказаў галоўны ўрач санаторыя Міхаіл Колб, работы па будаўніцтве і рэканструкцыі ва ўстанове вядуцца даўно. У 2008 годзе санаторый пашырыўся да 150 ложкаў. Праведзена рэканструкцыя жылых карпусоў, лячэбнай базы, зоны адпачынку, добраўпарадкавана тэрыторыя. Сучаснае медыцынскае абсталяванне, якім аснашчаны санаторый, дазваляе на высокім узроўні праводзіць дыягностыку і лячэнне хворых з паталогіямі апорна-рухальнага апарату, страўнікава-кішачнага тракта, сардэчна-сасудзістай сістэмы, шчытападобнай залозы, са скурнымі захворваннямі. Пацыенты прымаюць фізіятэрапеўтычныя працэдуры, самыя розныя ванны, масаж. У комплексным лячэнні хворых разам з лячэбнымі і фізіяпрацэдурамі апошнім часам практыкуецца дазіраваная хада па спецыяльна распрацаваных маршрутах з улікам узросту і стану здароўя. А цяпер вось дадаўся ўтульны і прыгожы чацвёрты комплекс.

Удзельнікі адкрыцця нязменна падкрэслівалі, што такі падарунак санаторый атрымаў напярэдадні знамянальнай даты — 70-годдзя ўтварэння Пінскага раёна. А ў планах — пашырэнне санаторыя, будаўніцтва басейна, кавярні, іншых аб'ектаў за кошт Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Пінскі раён.*

Ну і ну

### П'ЯНЫ ВАДЗІЦЕЛЬ ЗНЁС СВЯТЛАФОР

**Гэта дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ў Гродне на перасячэнні праспекта Кляцкова і вуліцы Белуша, паведамілі ў абласной Дзяржаўтаінспекцыі.**

Вадзіцель не справіўся з кіраваннем «Фальксвагенам» пры павароце налева, у бок Румлёўскага маста, пасля чаго мікрааўтобус заскочыў на астравок бяспекі і знёс святлафор. Экспертыза паказала, што ўтрыманне алкаголю ў арганізме вадзіцеля больш чым утрая перавышала дапушчальную норму, хоць спачатку ён і адмаўляў факт ужывання спіртнога.

Пакаранне будзе вельмі сур'ёзным — пазбаўленне правоў, штраф і, акрамя таго, трэба не толькі рамантаваць за свой кошт аўтамабіль, але і разлічыцца за зламаны святлафор і тры дарожныя знакі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 28 ЯНВАРЯ 2010 ГОДА 95-ГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

### по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска

| № лота | Адрес, тип помещения, целевое назначение | Арендуемая площадь, кв. м | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска», тел. 285 56 02** | | |
| 1 | Ул. Варвашени, 20, корп. 2, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис), склад. | 165,28 | 2 900 |
| | **КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска», тел. 223 35 03** | | |
| 2 | Ул. Белорусская, 14, цокольное помещение, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис). | 25,3 | 500 |
| 3 | Ул. Белорусская, 14, цокольное помещение, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис). | 18,32 | 400 |
| 4 | Ул. Кирова, 23, помещение на первом этаже жилого дома, имеется естественное освещение, водоснабжение, требуется реконструкция, перепрофилирование с обустройством отдельного входа. Под медуслуги, стоматологию. | 55,9 | 5 000 |
| 5 | Ул. Прушинских, 60, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, водоснабжение, требуется реконструкция. Под административные цели (офис), торговый объект или парикмахерскую. | 66,4 | 3 500 |
| | **КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска», тел. 252 80 63, 207 10 89** | | |
| 6 | Пр. им. газеты «Звязда», 22, корп. 1, помещение, пристроенное к жилому дому. Под объект торговли или отделение банка. | 547,4 | 10 000 |
| 7 | Ул. Грушевская, 11, помещение в цоколе жилого дома. Под административные цели (офис). | 33,7 | 600 |
| 8 | Ул. Короля, 49, помещение в подвале жилого дома. Под административные цели (офис). | 43,6 | 800 |
| 9 | Ул. Короля, 6, помещение, пристроенное к первому этажу и цоколю жилого дома. Под склад. | 158,5 | 2 800 |
| | **КУП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска», тел. 294 01 11** | | |
| 10 | Ул. Долгобродская, 4, помещения на 1 и 2 этажах, при условии обустройства входа со стороны главного фасада. Под объект общественного питания. | 248,34 | 10 000 |
| 11 | Ул. Первомайская, 24/1, помещение на первом этаже, при условии обустройства отдельного входа. Под административные цели (офис). | 15,0 | 300 |
| | **КУП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска», тел. 285 72 92** | | |
| 12 | Ул. Белинского, 9, помещения первого этажа – 249,2 кв.м, подвальные помещения – 196,6 кв.м, в подсобных помещениях требуется ремонт. Под объект общественного питания. | 445,8 | 10 000 |
| 13 | Ул. Волгоградская, 42 а, помещение на первом этаже. Под склад. | 35,7 | 700 |
| 14 | Пр. Независимости, 155, корп. 1, помещение на втором этаже. Под магазин непродовольственной группы товаров. | 79,2 | 2 000 |
| | **КУП «ЖРЭО Советского района г. Минска», тел. 292 74 31** | | |
| 15 | Ул. Восточная, 190, помещение на втором этаже. Под административные цели (офис). | 15,7 | 300 |
| 16 | Ул. Козлова, 7, помещение на первом этаже. Под административные цели (офис). | 10,5 | 200 |
| 17 | Ул. Некрасова, 25, помещение на первом этаже, требуется ремонт. Под административные цели (офис). | 22,63 | 400 |
| | **КУП «ЖРЭО Фрунзенского района № 1 г. Минска», тел. 204 30 46** | | |
| 18 | Ул. Д. Марцинкевича, 6, корп. 2, изолированное помещение в цокольном этаже жилого дома, имеется отдельный вход. Под торговый объект непродовольственной группы товаров. | 100,0 | 2 000 |
| | **КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска», тел. 203 79 43, 203 34 66** | | |
| 19 | Пр. Победителей, 75, помещение на первом этаже. Под торговый объект продовольственной, непродовольственной группы товаров. | 14,2 | 2 000 |
| 20 | Ул. М. Танка, 34, корп. 1, помещение на первом этаже. Под бытовые услуги. | 96,9 | 2 000 |
| | **КУП «Минская спадчина», тел. 226 53 04, 226 47 34** | | |
| 21 | Пл. Свободы, 2, помещение на втором этаже. Под административные цели (офис). | 13,1 | 300 |
| 22 | Пл. Свободы, 5/17, комната на первом этаже, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис) или оказание услуг населению: туристические, риэлтерские, страховые услуги. | 34,12 | 2 000 |
| 23 | Пл. Свободы, 5/17, блок из двух комнат на антресольном этаже, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис) или оказание услуг населению: туристические, риэлтерские, страховые услуги) | 35,0 | 2 000 |
| 24 | Ул. Интернациональная, 23, блок из пяти комнат и двух подсобных помещений на втором этаже. Под административные цели (офис) или оказание услуг населению: туристические, аудиторские, информационные, риэлтерские. | 158,3 | 3 000 |
| 25 | Ул. Комсомольская, 7, блок из двух комнат в мансарде, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис). | 44,3 | 800 |
| 26 | Ул. Комсомольская, 7, комната в мансарде, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис). | 9,4 | 200 |
| 27 | Ул. Комсомольская, 7, две комнаты в мансарде, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис). | 21,0 | 400 |
| 28 | Ул. Комсомольская, 15, четыре комнаты на втором этаже, имеется естественное освещение. Под административные цели (офис) или магазин непродовольственной группы товаров. В случае аренды под магазин – производство интерьерных работ и приспособление помещений, разработка проектно-сметной документации, строительно-монтажные работы – за счет средств арендатора. | 81,51 | 1 500 |
| 29 | Ул. Герцена, 10, двухэтажное здание с подвалом, с условием приспособления помещений подвала (132,5 кв.м) – под тренажерный зал, первого этажа (118,0 кв.м) – под магазин непродовольственной группы товаров или оказание услуг населению (кроме парикмахерских и медицинских услуг), второй этаж (179,3 кв.м) – под административные цели (офис). Производство интерьерных работ и приспособление помещений, разработка проектно-сметной документации, строительно-монтажные работы – за счет средств арендатора. Аренда с момента ввода здания в эксплуатацию. | 429,8 | 8 000 |
| 30 | Ул. Революционная, 14, цоколь, блок их четырех комнат, имеется естественное освещение. Производство интерьерных работ и приспособление помещений, разработка проектно-сметной документации, строительно-монтажные работы – за счет средств арендатора. Под оказание услуг населению (кроме парикмахерской). | 73,1 | 1 300 |
| | **Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома, тел. 220 51 34, 219 00 78** | | |
| 31 | Пл. Независимости, подземный переход № 8, помещение № 8. Под розничную торговлю непродовольственными товарами. | 36,5 | 1 000 |
| 32 | ТЦ «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 23. Под торговлю непродовольственными товарами. | 9,7 | 1 000 |
| | **КУП «Минсктранс», Филиал «Троллейбусный парк № 2», тел. 249 42 70** | | |
| 33 | Ул. О. Кошевого, 1, помещение в здании диспетчерской станции, имеется отопление, энергоснабжение. Под административные цели (офис). | 8,5 | 200 |
| | **ТКУП «Минский комаровский рынок», тел. 331 84 00** | | |
| 34 | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор 1, ряд № 10, павильон № 6. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами. | 3,6 | 500 |
| 35 | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор 1, ряд № 10, павильон № 10. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами. | 3,6 | 500 |
| 36 | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор 1, ряд № 10, павильон № 16. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами. | 3,6 | 500 |
| 37 | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор 2, ряд № 10, павильон № 6. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами. | 3,6 | 500 |
| 38 | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор 2, ряд № 10, павильон № 9. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами. | 3,6 | 500 |
| 39 | Ул. В. Хоружей, 8, территория сезонного (открытого) рынка, сектор 4, ряд № 8, павильон № 2. Под торговлю продовольственными и непродовольственными товарами. | 5,8 | 600 |
| | **УП «Бытэкс», тел. 203 79 66, 306 28 41** | | |
| 40 | Ул. Кульман, 5, помещения №№ 15, 16, 17, 18, 19 без естественного освещения на втором этаже. Под платный общественный туалет. | 22,9 | 500 |
| 41 | Ул. Московская, 20, помещения №№ 18,19, 20, 21 без естественного освещения на первом этаже. Под платный общественный туалет. | 21,12 | 400 |
| 42 | Ул. Кульман, 5, три смежных помещения №№ 41, 41а и 42 на третьем этаже, имеется естественное освещение. Под производственное использование или бытовые услуги. | 73,5 | 1 500 |
| | **КУП «Белизна», тел. 267 89 44** | | |
| 43 | Ул. Кнорина, 55, помещения на втором этаже. Под административные цели (офис). | 46,4 | 900 |
| 44 | Ул. Кнорина, 55, помещения на втором этаже, в том числе 27,9 кв.м – без естественного освещения. Под административные цели (офис). | 64,8 | 1 200 |
| | **ОАО «Строительный трест № 4», тел. 280 26 96** | | |
| 45 | Ул. П. Бровки, 32, помещение в здании столовой. Под административные цели (офис). | 17,86 | 400 |
| | **ОАО «Строительный трест № 1», тел. 294 21 35** | | |
| 46 | Ул. Пугачевская, д.3, комната 34 на третьем этаже. Под административные цели (офис). | 16,7 | 300 |
| 47 | Пр. Машерова, 20, комнаты 203, 204, 205 на втором этаже. Под административные цели (офис). | 42,8 | 800 |
| | **ГПО «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома», тел. 233 74 31** | | |
| 48 | Ул. Кижеватова, 62а, комната в одноэтажном здании. Под склад. | 19,4 | 400 |
| | **СМУ-1 УП «Минскметрострой», тел. 285 32 08** | | |
| 49 | Ул. Раковская, 34, комнаты №№ 32, 33 и 34 в цокольном этаже, требуется косметический ремонт. Под склад. | 83,9 | 2 000 |
| | **Учреждение «Специализированная детско-юношеская школа олимпийского резерва по борьбе», тел. 227 38 93** | | |
| 50 | Ул. Карбышева, 46/1, площадь в здании спорткомплекса школы. Под кафетерий. | 27,89 | 500 |

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

**Аукцион состоится 28 января 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

**Документы на участие принимаются с 18 по 26 января 2010 г. в рабочее время, 27 января 2010 г. с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.**

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Осмотр объектов недвижимости, право заключения договоров аренды которых выставлено на аукцион, обеспечивают арендодатели.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в срок, установленный законодательством и решением Мингорисполкома о сдаче в аренду.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

**Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by.**



# ІШЛІ З ПАХОДНЯЮ «ЦАРЫ»

ПРАКАВЕТНАЕ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й. стар.)

НАПЭЎНА, сярод беларускіх даследчыкаў фальклору і народных традыцый было нямала спрэчак наконт таго, што сімвалізуе гэты абрад, чаму называецца «Цары» і праводзіцца якраз у Шчодры вечар, калі ў ноч з 13 на 14 студзеня традыцыйна водзяць казу і спяваюць калядкі. Тут жа маршыруюць па вёсцы хлопцы ў белых касцюмах і каўпаках-цыліндрах на галовах, з мячамі і паходнямі ў руках ды яшчэ напяваюць рускую народную песню «Посею лебеду на берегу...». І чаму «Царам» першым нададзены гэткі высокі ахоўны статус, хоць у краіне на сёння вылучаны 13 нематэрыяльных аб'ектаў, узятых пад ахову дзяржавы? На ўсялякі выпадак зазірнуў у энцыклапедыю «Беларускі фальклор» і даведаўся, што ў мінулыя стагоддзі на тэрыторыі Беларусі шырока бытавала народная драма пра цара Максіміляна, а ў сярэдзіне XIX стагоддзя зроблены першыя фіксаванні паказаў гэтай драмы на Каляды. Семежаўскія «Цары» — адна з вясёлых інтэрпрэтацый, якую на свой густ ладзілі мясцовыя калядоўшчыкі. У суседніх вёсках Капыльшчыны і Случчыны «Цары» таксама спраўляліся, але захаваліся яны толькі ў Семежаве — вёсцы, узрост якой сягае за 400 гадоў.

Нягледзячы на 15-градусны мароз, госць з Японіі Нарыта Кунісу (цяпер ён жыве і працуе ў Парыжы) ад «Цароў» не адмовіўся. Каб замежнік не адчуваў сябе некамфортна, яму прапанавалі традыцыйныя семежаўскія валёнкі і кажушок. Як беларускія фота і кінааператары, якіх сапраўды было неверагодна шмат, ён з задавальненнем назіраў за карнавальнымі сцэнкамі на вуліцах і рабіў фотаздымкі ў хатах аграгарадка. А ў кожным двары, куды збочвала «царская» дружына, віталі з хлебам-соллю. Пасля «шабельных паядынкаў» цара Максіміляна з царом Мамаем у калядны мех клаліся падзякі ў выглядзе грошай, цукерак, сала з каўбасою і вядома, «гарбузікаў», празваных «семежаўскімі снікерсамі». Старэйшая семежаўская гаспадыня Вера Рудазуб, калі і да яе прыйшоў вясёлы гурт, глядзела на «Цароў» праз слёзы. Я запытаўся, чаму яна гэтак эмацыйна перажывала ўбачанае, на што баба Вера адказала, на маю думку, вельмі пераканаўча: «Я ўжо ў такім веку, што бачу «Цароў», магчыма, у апошні раз». Ці трэба тлумачыць, што ў такія хвіліны старэйшыя семежаўцы вяртаюцца ў сваю далёкую і не менш шчаслівую маладосць.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

**НА ЗДЫМКАХ моманты каляднага абходу «Цары». Японскі журналіст запомніць іх надоўга.**
*Капыльскі раён.*





# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.20 | 16.18 | 7.58 |
| Віцебск — | 8.16 | 16.02 | 7.46 |
| Магілёў — | 8.10 | 16.08 | 7.58 |
| Гомель — | 7.59 | 16.12 | 8.13 |
| Гродна — | 8.34 | 16.35 | 8.01 |
| Брэст — | 8.27 | 16.43 | 8.16 |

## Месяц

*Маладзік у 9.12.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

## Імяніны

**Пр.** *Ульяны, Серафіма, Сільвестра.*

**К.** *Арнольда, Ізыдара, Макара, Паўла.*


Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




## 15 студзеня

Дзве даты



**1850 год** — 160 гадоў назад нарадзілася Соф'я Кавалеўская, славуты расійскі матэматык. Першая ў свеце жанчына-прафесар, першая жанчына — член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук. Вырасла ў Віцебскай губерні ў маёнтку свайго бацькі — генерала Корвін-Крукоўскага, які паходзіў са старажытнай беларускай шляхты. Асноўныя навуковыя працы Соф'і Кавалеўскай прысвечаны матэматычнаму аналізу, механіцы і астраноміі. Аўтар рамана «Нігілістка» і мемуараў «Успаміны дзяцінства».

**1938 год** — у Беларусі створаны першыя вобласці — Віцебская, Гомельская, Мінская, Магілёўская і Палеская (існавала да 1954 года). Да гэтага тэрыторыя рэспублікі дзялілася на губерні, а з 1924 года — на акругі.

Цытата дня:

*«Мастацтва — заўсёды абмежаванне. Сэнс любой карціны ў яе рамцы».*
**Гілберт Кіт ЧЭСТЭРТОН (1874-1936), англійскі пісьменнік.**

# «ДАЙ, БОЖА, ЗНАЦЬ, З КІМ ВЕК ВЕКАВАЦЬ»

Свет і сусвет чалавека

**Распавед пра Каляды будзе далёка не поўным, калі мы пакінем па-за ўвагай народных святкаванняў яшчэ адну найцікавейшую складаную частку — варажбу моладзі аб сваім далейшым лёсе.**

- У адпаведнасці з уяўленнямі нашых прашчураў, варажыць чалавеку можна было толькі адзін раз у жыцці пры вырашэнні самага адказнага, лёсавызначальнага пытання. Часцей за ўсё дзяўчаты марылі аб сваім каханым-нарачоным.
- Для таго каб даведацца, пойдуць яны замуж ці не, дзяўчаты беглі пад вокны суседняй хаты і прыслухоўваліся да гутаркі гаспадароў паміж сабой або з гасцямі, якія да іх завіталі. Калі ў падслуханай размове гучалі дзеясловы руху (пайсці, спяшацца, час дадому збірацца), то дзяўчаты з радасцю выбягалі на вуліцу. Словы гэтыя для іх мелі сімвалічны змест: «пайсці» магло ў абрадавым кантэксце значыць толькі адно — «пайсці замуж», стварыць новую сям'ю. Калі да дзяўчат даляталі словы накшталт «не спяшайся, пасядзіце, вечар яшчэ доўгі», — гэта ўспрымалася весткай аб тым, што вяселле ў гэтым годзе спраўляць не давядзецца.
- Дзяўчаты выбягалі ў двор, хапалі з кастра бярэмя дроў і неслі ў хату, кідалі каля печы, затым лічылі. Цотная колькасць прадвяшчала замужжа, няцотная — працяг дзявоцтва. Той самы сэнс мела варажба, калі дзяўчаты выбягалі на вуліцу і аберуч хапаліся за плот, а затым лічылі колькасць ахопленых штыкецін.
- Збіральнікі народнай творчасці запісалі і такі варыянт варажбы. Дзяўчаты бралі ночвы, у якіх мылі бялізну, налівалі ў іх ваду, зрывалі з веніка ў лазні два лісточкі, прасоўвалі скрозь іх маленькія свечкі і пускалі на ваду з двух бакоў начовак. Калі лісты/свечкі сыдуцца — вяселле маладыя справяць.
- Дзяўчаты збіраліся ў адной якой-небудзь хаце і імкнуліся знайсці адказ на пытанне, хто першы замуж пойдзе. З гэтай мэтай варажбіткі клалі на падлогу абруч з бочкі, сыпалі кругам па жменьцы жыта, прыносілі пеўня і ставілі яго побач з абручом або ў яго сярэдзіну. Чые зярняты ён пачне дзяўбці першымі, той і трэба было спяшацца з падрыхтоўкай пасагу.
- У якасці вясковага прадказальніка лёсу мог выступіць і сабака. Некалькі дзяўчат-варажбітак выпякалі фігуркі хатніх жывёл або аладкі, раскладвалі кожны сваю на парозе і клікалі сабаку, якога папярэдне добра кармілі, каб ён не хапаў усё без разбору. Чыё печыва сабака з'есць найперш, тая першай і стане на ручніку падчас вянчання ў храме.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Праверце, калі ласка, адказы

**Сканворд (30 снежня 2009 г.) Па гарызанталі:** Кёрлінг. Фрыстайл. Глінка. Метад. Гурба. Рып. Нарды. Увал. Баранка. Лён. Сталь. Ясак. Рада. Бур. Татары. Руда. Рак. Зад. Парыж. Гітара. Ном. Ямс. Мана. Квас. Кулі. Апіс. Пантон. Скелятон. **Па вертыкалі:** Сноўбордынг. Горад. Абуза. Рунь. Ударнік. Ат. Нуга. Града. Манас. Стакан. Філе. Суп. Торба. Ліс. Рыкша. Меніск. Дрыль. Пас. Лава. Пуня. Скарына. Ага. Ражон. Магул. Клык. Манекен.

**Сканворд (31 снежня 2009 г.) Па гарызанталі:** Шампанскае. Буян. Апарат. Пасма. Рог. Копра. Узда. Люцэрна. Сыр. Зорка. Табу. «Аякс». Лан. Быліна. Татамі. Дар. Лес. Базар. Рычаг. Дож. Маяк. Эстакада. Фал. Зебу. Амар. Бункер. Снягурка. **Па вертыкалі:** Ёлка. Торт. Пацук. Слалам. Сера. Амега. Іслам. Аніс. Паказ. Квазар. Амбра. Лем. Рупар. Бас. Піяла. Сатурн. Траса. Біт. Рыба. Гурт. Алідада. Дуб. Народ. Лёска. Улар. Жалейка.

**Сканворд (13 студзеня) Па гарызанталі:** Машыніст. Отс. Апрош. «Тоска». Гіпс. Эрас. Амур. Атлас. Дыля. Ролік. Квота. Дока. Агніца. Спрынт. Паласа. Кір. Ясак. Влтава. Мір. Ягня. Кук. Рыза. Графа. Арка. Рот. Этап. Тара. Цар. Станцыя. **Па вертыкалі:** Чыгунка. Пірог. Перон. Лямка. Івасі. Пляц. Саркафаг. Купэ. Абак. Рак. Карэта. Трактат. Ротар. Осла. Гектар. Рыс. Пас. Тло. Каска. Вяз. Шрам. Апал. Удод. Тур. Рыторыка. Лак. Нівоз. Шыя. Астра. Апатыя.

Віншую любую матулю **Ніну Мікалаеўну НАВІЦКУЮ з 75-годдзем**. Жадаю бадзёрага настрою, моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця.
**Дачка Алёна,**
*г. Мінск.*

**Валянціну Аляксандраўну КАСТЭЧКУ з юбілеем**. Зычым здароўя, шчасця, сямейнага дабрабыту.
**Кусойцы.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



# ПАКАЗАЛЬНЫ ПАЛАНЭЗ У МАГІЛЁВЕ

**На стары Новы год у абласным цэнтры адбыўся баль-маскарад «Чароўная ноч». У ім бралі ўдзел танцоры, творчая інтэлігенцыя і вядомыя людзі горада, прадстаўнікі ўлады. Баль наведаў намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валеры Сямашка з жонкай Ірынай.**

Першы баль у Палацы шлюбаў, які месціцца ў прыгожым старажытным будынку, адбыўся летась. Усім удзельнікам спадабалася прыгожая ідэя, і баль 13 студзеня вырашылі зрабіць традыцыйным.

Сёлета ўсе госці паклапаціліся не толькі пра вечаровыя строі, але і цікавыя маскі. Баль у Залатой зале адкрыўся паказальным паланэзам, у адпаведнасці з традыцыяй баляў у губернскім Магілёве XIX стагоддзя. Граў камерны аркестр гарадской капэлы. За першым танцам пайшлі вальс, мазурка, полька. Прафесійныя танцоры дапамагалі гасцям асвоіць нескладаныя па. Баль упрыгожылі ўсходнія танцы, дэфіле прыгажунь у кветкавых строях, гульня ў фанты.

**Ілона ІВАНОВА.**


Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Выстава

# І хобі, і любоў, і праца

Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Прафесійная творчая арцель мастакоў» ладзіць у салоне «Мадэрн» у Мінску (вул. Прытыцкага, 42, бібліятэка Ф. Багушэвіча) выставу пяці арыгінальных, крэатыўных мастачак. Кожная з іх ідзе сваім шляхам, кожная шукае сваю мову, каб быць сугучнай часу. А ўсе разам яны дораць людзям прыгажосць і цудоўны настрой.

**Святлана АМЕЛЬЧАНКА, Наталля ГУРЫНОВІЧ, Яўгенія ГЕРЦЫК** працуюць у тэхніцы роспісу па шоўку, лямцу. Пано Святланы і Наталлі ўражваюць сваёй глыбінёй, а некаторыя яшчэ і памерам, перадаюць унутраныя перажыванні, адчуванні чалавека. Калі Святлана Амельчанка, зразумеўшы, што ёй падабаецца праца з тканінай, скончыла Акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці мастацкі тэкстыль, то ў Яўгеніі Герцык, настаўніцы па адукацыі, усё пачыналася з хобі. Яна самастойна па кнізе, метадам спробаў і памылак асвоіла тэхніку батык і цяпер на выставе прапаноўвае гледачу ўпрыгажэнні ў выглядзе хустачак, шалікаў, адзенне з шоўку, распісанае ў гэтай тэхніцы, дэманструе таксама тэхніку злучэння абрэзкаў розных відаў шоўку, перапляценне розных фактураў.

Мастачка **Таццяна ЯРМОЛЬЧЫК**, якая піша карціны алеем у сюррэалістычным напрамку, у свет жывапісу прыйшла з архітэктуры, таму ў працы абапіраецца на законы кампазіцыі, сіметрыі. Для яе вельмі важныя ўражанні, якія выклікаюць яе палотны: ці падабаюцца, ці кранаюць за душу, ці ёсць у іх збалансаванасць, агульная гармонія?

Рэцэпт прац **Алы МІСЮК**, як лічыць яна сама, між іншым прафесійны фларыст, просты: кветкі разбавіць дрэвам, потым металам, шклом, дадаць крышку гіпсу, шпаклёўкі, паперы, скуры, лямцу — і атрымліваюцца арыгінальныя пацеркі, бранзалеты, шалікі, пано, аб'ёмныя кампазіцыі...

Убачыць гэту прыгажосць на свае вочы і пагутарыць з мастачкамі можна будзе 16 і 17 студзеня з 14.00 да 17.00 у салоне «Мадэрн».

**Святлана ДУДА.**


Фота Святланы ГРЫГОР'ЕВАЙ.

## Усміхнемся!

**На дыеце трэба не сядзець, а рухацца!**

☺

Жонка — мужу:
— Кідай піць!
— Не магу: сілы волі няма.
— Ага! А як цэлы год з жонкай сэксам не займацца — дык, значыць, ёсць?!

☺

**Сцвярджэнне «Мне няма ў чым хадзіць» звычайна заканчваецца пытаннем: «Ты мяне кахаеш?».**

☺

Бацька выхоўвае сына-студэнта:
— Замест таго, каб вучыцца, ты, дурань, усё па дзеўках бегаеш!
— Разумееш, тата...
— Маўчы! Хто тут бацька, ты або я?
— Абодва, тата, абодва...

☺

**Людміла Гурчанка любіць гуляць у дрымучым лесе, які яна сама і пасадзіла.**




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 183. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12